**Вольга Урбан (г. Мінск)**

# КАНФІКСАЛЬНАЕ ЎТВАРЭННЕ АЦЭНАЧНЫХ СУБСТАНТЫВАЎ У БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯЛЕКТНАЙ МОВЕ

У беларускай дыялектнай мове шляхам канфіксацыі ўтвараецца шэраг назоўнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі. Дэрывацыя асабовых ацэначных субстантываў адбываецца ад асноў назоўнікаў, дзеясловаў і прыметнікаў (у адрозненне ад літаратурнай мовы, дзе “прэфіксальна-суфіксальныя назоўнікі ўтвараюцца ў асноўным ад саміх назоўнікаў, рэдка – ад дзеясловаў і прыметнікаў” [БГ 1985, с. 280]).

<u>Адсубстантыўныя назоўнікі</u>. Вялікую групу асабовых ацэначных субстантываў складаюць дэрываты, утвораныя ад адушаўлёных і неадушаўлёных назоўнікаў адзіночнага (радзей множнага) ліку. Пры дэрывацыі перад суфіксам магчымы тыя ж марфаналагічна абумоўленыя з'явы, што і пры ўтварэнні ацэначных назоўнікаў з адпаведным фармантам, таму будуць разглядацца толькі спецыфічныя выпадкі марфаналагічных працэсаў. У большасці вытворных слоў націск на перадсуфіксальным складзе.

Конфікс **ад- + -ак** надае субстантывам значэнне супрацьлегласці таму, што названа ўтваральным словам: людзі − *адлю́дак* 'дзікун' (гродз.). Назоўнік з конфіксам **ад- + -нік** мае тое ж значэнне, што і папярэдні: людзі − *адлю́днік* (гродз.). Дэрываты маюць адценні пагардлівасці, грубасці.

Усе канфіксальныя адсубстантыўныя пеяратывы з прыстаўкай **без-** характарызуюць асоб паводле адсутнасці таго, што названа матывавальным словам, і маюць ацэначныя адценні асуджэння, пагардлівасці. Дэрывацыя адбываецца пры дапамозе наступных конфіксаў: **без-(бяз-, бес-) + -авіч**: *бязба́цькавіч* 'сваволькік, неслух'; *бясхле́бавіч* 'хто не мае хлеба' (віц., маг.); **бяз- + -ак**: *бязве́рак* 'недаверлівы', *бяздо́мак* 'легкадумны' (віц., маг.); **бяз- (без-) + -ец**: *бяздо́мец* 'дурань', *безгало́вец* 'тс' (маг.); **бяз- + -іц-а**: *бяздо́міца* 'дурань, неслух' (маг.); **бяс- + -іч**: *бясхле́біч* 'бядняк' (маг.); **без-(бяз-, бес-, бяс-) + -нік**: *бязлю́днік* 'нелюдзім', *бязвсты́днік* і *бяссты́днік* 'бессаромнік', *бессаро́мнік* 'тс', *безробо́тнік* 'гультай'; тып агульнабеларускі. Некаторыя назоўнікі суадносяцца з прыметнікамі на -ны: бясстыдны − *бяссты́днік*, бессаромны − *бессаро́мнік*.

Пеяратыў мужчынскага роду з конфіксам **вод- + -нік** мае значэнне супрацьлегласці таму, што названа ўтваральным словам: людзі − *во́длюднік* 'пануры, хмуры чалавек' (гродз.) − з асуджэннем. Назоўнік, утвораны пры дапамозе конфікса **вы- + -ень**, мае такое ж агульнае значэнне, што і папярэдні дэрыват: людзі − *вы́людзень* 'вырадак' (гродз.).

Субстантывы з конфіксам **за- + -нік** характарызуюць асоб паводле адносін да таго, што названа матывавальным словам, або паводле стану: *завуго́льнік* 'пляткар', *зако́жнік* 'хто жыве за кошт іншага' (шт//ж − чарг.), *заку́снік* 'нелюдзень' (т//с' − чарг.), *заку́тнік* 'тс', *запе́чнік* 'хто любіць ляжаць на печы', *заўго́льнік* 'гультай', *захрыбе́тнік* 'дармаед' (гом., гродз., маг.). У маўленні дэрываты набываюць адценні асуджэння, іроніі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пеяратыў, утвораны пры дапамозе конфікса **на-** + **-ніц-а**, характарызуе асобу жаночага полу паводле абазначанага ўтваральным словам: *напарóзніца* 'жанчына, якая, зайшоўшы да кагосьці на хвіліну, доўга стаіць на парозе' (маг.).

Назоўнікі з прыстаўкай **не-** (кампанентам конфікса) абазначаюць асоб па іх уласцівасцях, унутраных якасцях ці адсутнасці таго, што названа матывавальным словам, маюць адценні пагардлівасці, асуджэння. Пеяратывы мужчынскага, жаночага і агульнага роду ўтвараюцца пры дапамозе конфіксаў: **не-** + **-ень**: *нéлюдзень*, тып агульнабеларускі; **не-** + **-j-а**: *нéлюддзя* 'нелюдзім' (маг.); **не-(ня-)**+ **-нік**: *нялю́днік* 'нелюдзім', *нясты́днік* 'сараматнік' (віц., гом., мін.).

У беларускай дыялектнай мове ўжываюцца ацэначныя субстантывы, утвораныя пры дапамозе нязвыклых конфіксаў, што тлумачыцца асаблівасцямі народнага словаўтварэння: **неда-** + **-ак**: *недалю́дак* 'нелюдзь' (мін.); **неў-(няў-)** + **-j-э**: *няўлю́ддзе* 'нелюдзь' (віц., маг.).

Пеяратывы з конфіксамі, у склад якіх уваходзіць прэфікс **па-**, называюць асоб па адносінах да абазначанага ўтваральным словам. Назоўнікі набываюць у маўленні адценні зневажальнасці, асуджэння, неадабрэння. Ацэначныя субстантывы жаночага, мужчынскага і агульнага роду з названым значэннем утвараюцца пры дапамозе наступных конфіксаў: **па-** + **-айк-а**: сяло − *пасілáйка* 'хто ходзіць па хатах без справы' (мін.); **па-** + **-д-а**: сяло − *пасялдá* 'тс' (мін.); **па-** + **-ень**: сяло − *пасялéнь* 'тс', хлопец − *пахлапéнь* 'мужчынападобная жанчына', фіналь -*ец* адсякаецца (віц., мін.); **па-** + **-нік**: палавіна − *папалаві́ннік* 'п'яніца', цянёк − *пацянéчнік* 'гультай' (брэсц., гом.); **па-** + **-ніц-а**: сяло − *пасéльніца* і *пасёльніца* 'пахатуха', хата − *пахáтніца* 'тс' (брэсц., гом., мін.); **па-** + **-ун**: сяло − *пасялу́н* 'хто ходзіць па сяле без справы' (віц., гродз.); **па-** + **-ух-а**: двор − *падвóруха* 'гультайка, якая ходзіць па хатах пасядзець і пагаварыць', сяло − *пасялу́ха* 'тс', хата − *пахáтуха* 'тс', *пахату́ха* 'тс', тып агульнабеларускі; **па-** + **-ынд-а**: сяло − *пасялы́нда* 'той, хто любіць хадзіць па хатах' (мін.).

Ацэначныя назоўнікі з прыстаўкай **пад-** у складзе конфіксаў абазначаюць асоб па месцы знаходжання або росту адносна таго, што названа ўтваральным словам: **пад-** + **-ак**: цурбан − *падцурбáлак* (н//л − чарг.) 'нізкарослы' (мін.); **пад-** + **-нік**: акно − *падвóканнік* 'мужчына, які заглядвае цішком у чужыя вокны' (мін.); **пад-** + **-ніц-а**: акно − *падвóкніца* 'жанчына, якая любіць заглядваць без прычыны ў чужыя вокны', плот − *падплóтніца* 'распусніца' (гом., мін.). Усе названыя дэрываты маюць адценні пагардлівасці, непахвальнасці.

Назоўнік з конфіксам **пра-** + **-ніц-а** мае значэнне 'асоба, якая знаходзіцца між тым ці з'яўляецца часткай таго, што названа матывавальным словам': хата − *прахáтніца* 'хто ходзіць па хатах і разносіць плёткі' (брэсц.) − з асуджэннем.

<u>Аддзеяслоўныя назоўнікі</u>. Утварэнне асабовых аддзеяслоўных назоўнікаў са значэннем ацэнкі адбываецца таксама пры дапамозе розных конфіксаў. Фінальная галосная ўтваральнай асновы адсякаецца, націск звычайна на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перадсуфіксальным складзе вытворнага субстантыва. Як і ў выпадку з адсубстантыўнымі канфіксальнымі дэрыватамі, пры характарыстыцы будуць адзначацца толькі асаблівасці словаўтварэння (адхіленні ад агульных заканамернасцей).

Назоўнікі з прыстаўкай **а-** (часткай конфіксаў) маюць агульнае значэнне 'асоба–носьбіт працэсуальнай прыкметы, названай матывавальным словам'; у маўленні набываюць адценні зневажальнасці, асуджэння. Субстантывы з названым значэннем утвараюцца пры дапамозе конфіксаў: **а-** + **-анец** – жыгаць – *ажыга́нец* 'свавольнік; хто хутка зношвае адзенне' (гродз.); **а-** + **-ель** – кпіць – *акпі́цель* 'насмешнік' (гродз.); **а-** + **-л-а** – жыгаць – *ажо́гла* (ы//о – чарг.) 'рашучая, бойкая жанчына' (гродз.).

Назоўнікі з конфіксамі **без-** + **-j-э** і **без-** + **-іц-а** абазначаюць асоб, якія характарызуюцца адсутнасцю таго, што названа ўтваральным дзеясловам: урадзіцца – *безуро́ддзе* і *безуро́дзіца* 'няўдаліца' (маг.) – з пагардлівасцю.

Пеяратывы з конфіксамі, у склад якіх уваходзіць прыстаўка **не-**, характарызуюць асоб, якія не здзяйсняюць ці не здольныя здзейсніць дзеянне, названае матывавальным словам. У якасці ўтваральных выступаюць асновы інфінітываў і асновы дзеясловаў цяперашняга часу. Ў маўленні дэрываты набываюць адценні асуджэння, пагардлівасці, радзей – пахвальнасці. Ацэначныя субстантывы ўтвараюцца пры дапамозе конфіксаў: **не-(ня-)** + **-ак**: наядацца – *ненае́дак* 'ненаедны' (маг.), укарміць– *няўко́рмак* 'у каго дрэнны апетыт' (гродз.). Назоўнік *ненаедак* суадносіцца з пеяратывам *ненаеда*, таму можа разглядацца як суфіксальны дэрыват (ненаеда – *ненае́дак*); **не-** + **-ач**: услухоўвацца – *неўслуха́ч* (*-оўва-* – адсякаецца) 'хто не прыслухоўваецца да іншых' (маг.); **не-** + **-аш**: *неўслуха́ш* 'тс' (маг.); **ня-** + **-авіч**: *няўслу́хавіч* 'тс' (маг.); **не-** + **-ень**: падабацца – *не́падабень* 'пра непрыгожую, неахайную асобу' (гом.), работаць – *не́рабацень* 'гультай' (гом.); **не-(ня-)** + **-j-э**: урадзіцца – *няўро́ддзе* 'нелюдзь' (маг.); **не-(ня-)** + **-к-а**: здолець – *нездале́ка* 'слабасільны, хваравіты', знае – *незна́йка*, мыцца – *нямы́ка*, разумець – *неразуме́ка* 'няспрытны, някемлівы', умець – *няўме́ка*, уставаць – *неўстава́ка* 'гультай'. Фінальная галосная ўтваральнай асновы захоўваецца. Некаторыя дэрываты суадносяцца з вытворнымі назоўнікамі і могуць лічыцца прыставачнымі ўтварэннямі (знайка – **ня***зна́йка*, умека – **ня***ўме́ка*). Тып агульнабеларускі; **не-** + **-л-а(о)**: ведаць – *неве́дало* 'няўмека' (гом.), забываць – *незабыва́ла* 'добрапамятлівы' (гродз.); **не-** + **-льшчыц-а**: чапаць – *нечыпа́льшчыца* 'недатыка' (гом.); **не-** + **-нік**: *здолець – нездале́тнік* 'нямоглы, слабы', наядацца – *ненае́днік* 'хто многа есць; сквапны чалавек' (гом., гродз., маг., мін.). Субстантыў *ненае́днік* суадносіцца з дэрыватам *ненае́да*; **не-(ня-)** + **-ніц-а**: здзелаць – *нядзе́льніца* 'няўмека' (маг.); **не-** + **-ух-а**: уміраць – *неўміру́ха* 'вельмі старая жанчына' (маг.).

Усе названыя дэрываты, у склад конфікса якіх уваходзіць прыстаўка **не-**, суадносяцца са спалучэннем "часціца *не* + дзеяслоў".

Субстантывы, утвораныя пры дапамозе прыстаўкі **неда-** і суфікса **-ак**, маюць значэнне 'асоба, якая не да канца ажыццяўляе дзеянне': верыць – *недавя́рак* і *недаве́рак* 'хто не верыць' – з асуджэннем, тып агульнабеларускі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэтыя назоўнікі могуць лічыцца і адпрыметнікавымі суфіксальнымі ўтварэннямі: *недаверлівы – недавéрак* (з адсячэннем фіналі -лів-).

Назоўнік агульнага роду з конфіксам **няўз-** + **-іц-а** абазначае асобу, якая не ажыццяўляе пэўнае дзеянне: зірнуць – *няўззóріца* (з адсячэннем фіналі -ну-) 'нелюдзім' (маг.) – з неадабрэннем.

Пеяратывы з прыстаўкай **па-** (часткай конфікса) абазначаюць асоб па схільнасці да выканання пэўнага дзеяння або працэсуальнай прыкмеце, маюць адценні грубасці, асуджэння, зневажальнасці, іроніі. Дэрываты прадстаўлены наступнымі канфіксальнымі ўтварэннямі: **па-** + **-алк-а**: совацца – *пасóвалка* 'хто ходзіць без справы' (гродз.); **па-** + **-ачк-а**: цягацца – *пацягáчка* 'пасялуха' (гом.); **па-** + **-ашк-а(-ешк-а)**: грабці (грабе) – *паграбáшка* 'хто ўсё бярэ сабе, ні ад чаго не адмаўляецца', цяўпці – *пацяўпéшка* 'тугадумны, недалёкі чалавек' (віц., гродз., мін.); **па-(по-)** + **-ень**: брыдзе – *пабрыдзéнь* 'валацуга', цяўпці – *пацяўпéнь* 'недалёкі', поўзаць – *пóпаўзень* 'паўзун' (віц., маг., мін.); **па-** + **-ік**: цямніць – *пацёмнік* 'маўклівы, негаваркі' (гродз.); **па-** + **-л-а**: цягаецца – *пацягáйла* 'гультай; павольны ў хадзе', чупае – *пачупáйла* 'марудлівы' (віц., гродз., маг.); **па-** + **-ух-а**: лётаць – *палятýха* 'жанчына, якая “лётае” з хаты ў хату, разносіць плёткі', таскацца – *патаскýха* 'тс', цягацца – *пацягýха* 'тс' (віц., гом., гродз., маг.); **па-** + **-як-а**: бадзяцца – *пабадзя́ка* 'валацуга; жанчына, якая любіць хадзіць па сяле', туляцца – *патуля́ка* 'бадзяга' (віц., гродз., мін.).

Назоўнік з конфіксам **с-** + **-ач** абазначае асобу паводле працэсуальнай прыкметы: цягацца – *сцягáч* 'бадзяга, валацуга' (мін.) – з пагардлівасцю.

<u>Адпрыметнікавыя назоўнікі</u>. У дыялектнай мове сустракаецца пэўная колькасць адпрыметнікавых канфіксальных ацэначных дэрыватаў. Утваральнымі выступаюць поўныя і ўсечаныя асновы прыметнікаў (радзей – дзеепрыметнікаў). Дэрывацыя адпрыметнікавых субстантываў адбываецца пры дапамозе наступных конфіксаў: **а-** + **-уш**: печаны – *апéкуш* 'здаровы, як выпечаны' (віц.); **за-** + **-л-я**: лупаты – *залупля́* 'непрыгожая асоба з вылупленымі вачамі' (маг.); **на-** + **-эй**: дурны – *надурэ́й* 'някемлівы чалавек' (брэсц.); **па-** + **-ец**: ветраны – *павéтранец* 'ветраны чалавек' (мін.); **па-** + **-к-а**: ветраная – *павéтранка* 'ветраная жанчына' (мін.). Усе названыя пеяратывы ў маўленні набываюць адценні асуджэння, зневажальнасці, пагардлівасці.

Літаратура:

Беларуская граматыка: у 2 ч. / Акад. навук БССР. Ін-т мовазн. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / Рэд.: М.В. Бірыла, П.П. Шуба. – 1985. – 431 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ